і пашырэннем колькасці прыхільнікаў новых, еўрапейскіх звычаеў і ладу жыцця: «Много тутока таких ест, што хоть наша костка, однак собачим мясом обросла и воняет!». Персанаж Мялешкі падкрэсліваў, што ранейшыя выступленні на соймах мелі больш праўдзівы і шчыры характар, і у параўнанні з сучаснымі не ператвараліся ў палітычны фарс, бясконцую дэмагогію і балбатню [2; с. 675]. Замежныя дарадцы караля і іх мясцовыя прыхільнікі з часов Жыгімонта ІІІ пачалі адыгрываць ўсё большую ролю у дзяржаўных справах, часам зусім не на карысць Вялікага Княства Літоўскага, што выклікала рэзка негатыўную рэакцыю мясцовай шляхты: «... не так виноват король, як тые радные баламуты, што при ним сидят да крутять ... А коли б такого беса кулаком в морду! Забыв бы другы мутити» [2; с. 676; 4; с. 186].

Асаблівае раздражненне у персанажа «Прамовы» выклікала прысутная ў Вялікім княстве дробная польская шляхта – «ляхи», якіх ён грэбліва называе «панкамі» – «паничыки». Іх напышлівае, ганарлівае стаўленне да мясцовай шляхты выклікала рэзкую рэакцыю: «Коли ж до тебе паничек приедеть, частуй же его достатком, да еще и жонку свою подле его посади. А он седить, як бес надувшись, морокуеть, шапкою, дей, перекривляет и з жонкою нашептываеть, дей и в долонку сробеть. Да коли ж бы гетакого чорта кулаком в морду, или по лицом, по хрибте, так штобы король, Его милость, не слыхал! Нехай бы морды такой поганой не надымал» [2, с. 675].

**Заключэнне.** Кіруючыя колы Вялікага Княства літоўскага, якія складаліся галоўным чынам з прадстаўнікоў буйной радавітай арыстакратыі і іхнай кліентэлы, пасля заключэння Люблінскай уніі 1569 г. імкнуліся ў гэты перыяд максімальна захаваць дзяржаўна-палітычныя інстытуцыі, што выяўлялі і забяспечвалі суверэнітэт дзяржавы найперш у дачыненнях з Польскім каралеўствам. Частка дробнай і сярэдняй шляхты выказвалі больш сімпатыі збліжэнню з польскай шляхецкай дэмакратыяй, якое падавалася ёй магчымасцю выйсці з-пад цяжкай падпарадкаванасці мясцовай арыстакратыі. У той жа час пашырэнне ў Вялікім Княстве Літоўскім новых, еўрапейскіх палітычных і культурных павеваў выклікала супярэчлівую, як зычлівую, гэтак і адмоўную рэакцыю у шляхецкім асяроддзі. У той жа час, публіцыстыка другой паловы XVI – першай паловы XVII ст. сведчыць аб у цэлым насцярожаным і нават негатыўным успрыняцці масай шляхты Вялікага Княства Літоўскага збліжэння з Польшчай і распаўсюджвання ў дзяржаве еўрапейскіх культурных і палітычных уплываў.

1 Лісты Ф.С. Кміты-Чарнабыльскага // Помнікі старажытнай беларускай пісьменнасці / Акадэмія навук БССР, Інстытут літаратуры імя Я. Купалы; уклад., уступ. арт. і камент. А.Ф. Коршунава; рэд. Ю.С. Пшыркоў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1975. – С. 39–110.
2 Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут літаратуры імя Я. Купалы; навук. рэд. В.А. Чамярыцкі. – Мінск: Беларуская навука, 2003. – С. 674–677.
3 Прашкович, Н.И. «Прамова Мялешкі» и «Ліст да Абуховіча» – новый этап в истории белорусской литературы / Н. Прашковіч // Труды Отдела древнерусской литературы. – Л.: Наука. Ленингр. отд-ние, 1969. – Т. XXIV. – С. 314–318.
4 Даўгяла, Зм. З беларускага пісьменства XVII ст.: творы Цыпрыяна Камунякі "Ліст да Абуховіча" і "Прамова Мялешкі": (гістарычна-літаратурны каментарый і тэксты) / Зм. Ів. Даўгяла. – Менск, 1927. – 45 с.

## АБ ШАРЫКАКАНЦОВЫХ НАЦЕЛЬНЫХ КРЫЖАХ XI–XII СТСТ. З ТЭРЫТОРЫІ ГЛЫБОЦКАГА РАЁНА ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

*М.А. Нікіфаровіч*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

У 2024 г. у ДУК «Глыбоцкі гісторыка-этнаграфічны музей» аўтарам былі перададзеныя пяць шарыкаканцовых нацельных крыжоў XI–XII стст., якія ён атрымаў ад прыватных асоб разам з падрабязнай інфармацыяй аб месцах іх знаходжання. Усе крыжы былі знойдзеныя ў перыяд з 2018 па 2022 год на тэрыторыі Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці. Публікацыя інфармацыі аб іх паспрыяе пашырэнню агульнай базы

археалагічных крыніц, што дасць магчымасць навукоўцам выкарыстоўваць гэтыя матэрыялы ў будучым, пры правядзенні больш грунтоўных тэматычных даследаванняў.

Мэта працы – даць навуковае апісанне шарыкаканцовых нацельных крыжоў XI–XII стст., знойдзеных на тэрыторыі Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці.

**Матэрыял і метады.** Асновай даследавання паслужылі археалагічныя артэфакты. Метады даследавання: агульналагічныя, агульнанавуковыя, спецыяльна-гістарычныя (гісторыка-сістэмны, рэтраспектыўны) і археалагічныя (апісанне, даціроўка, тыпалагічны).

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Без перабольшання, важнейшым працэсам канца эпохі ранняга Сярэднявечча на землях Беларусі з'яўляецца распаўсюджванне хрысціянства. Зробленыя за апошнія дзесяцігоддзі археалагічныя адкрыцці дазваляюць казаць, што на мяжы X і XI стагоддзяў пахавальны абрад на ўсёй тэрыторыі краіны мяняецца з крэмацыі на інгумацыю, што з'яўляецца безумоўным паказчыкам хрысціянізацыі мясцовага насельніцтва. У першай палове XI ст. спачатку ў акрузе Полацка, а потым і ў іншых рэгіёнах Падзвіння, да якога належыць і тэрыторыя Глыбоцкага раёна, пачынае распаўсюджвацца абрад пахавання ў магільных ямах з больш выяўнымі рысамі хрысціянскага канона [1, с. 99]. Акрамя таго, у пахаваннях гэтага часу пачынае назірацца змяншэнне выкарыстання агню ў абрадавых мэтах, рукі памерлага складаюцца на жываце, а пазней і бліжэй да грудзей [2, с. 90]. Гэтыя факты сведчаць аб пачатку актыўнага пранікнення хрысціянскіх догмаў у сацыяльна-культурнае асяроддзе не толькі эліт, але і сельскага насельніцтва Полацкай зямлі, якое жыло ў тым ліку і подаль ад тагачасных цэнтраў хрысціянізацыі. Другім відавочным маркерам гэтага працэсу стала з'яўленне ў культурным слоі XI ст. нацельных крыжоў, якія ў досыць значнай колькасці выяўляюцца на тэрыторыі Полацкай зямлі.

Накладаючыся на традыцыйныя паганскія вераванні мясцовага насельніцтва, новая рэлігія змяняе сваю форму і з цягам часу ствараецца сінтэз паганскіх вераванняў і знешняй хрысціянскай абрадавасці [3, с. 8]. Менавіта праз такі сінтэз першыя нацельныя крыжы набываюць мудрагелістыя дэкаратыўныя формы і пачынаюць трывала ўмацоўвацца ў сістэме духоўных каштоўнасцяў насельніцтва Полацкай зямлі.

Прадстаўленыя ў артыкуле нацельныя крыжы з-за характэрнай формы атрымалі сярод даследчыкаў назву шарыкаканцовыя. Усе яны адносяцца да шырока распаўсюджанага тыпу нацельных крыжоў з шарападобнымі канцамі на цыліндрычных лопасцях. Крыжы гэтага тыпу ў розных выкананнях без перабольшвання можна назваць адныімі з самых частых персанальных прадметаў раннехрысціянскага культу, якія трапляюць у рукі да археолагаў [гл.: 4, с. 32–47; 5, с. 207–253.]. Арэал іх распаўсюджання досыць шырокі і займае значную частку Усходняй Еўропы. Доказам гэтаму служыць знаходжанне падобных крыжоў як на землях сучаснай Беларусі [6, с. 100] і Украіны [7 с. 247–254], так і на тэрыторыі еўрапейскай часткі Расіі [8, с. 233–235].

Пры апісанні прыведзеных у артыкуле нацельных крыжоў мы будзем абапірацца на тыпалогію беларускага археолага А.А. Башкова, прадстаўленую ім у манаграфіі «Хрысціянскія старажытнасці Беларусі канца X–XIV стст. (прадметы хрысціянскага культу індывідуальнага выкарыстання)» [9].

**Крыж № 1** (мал.) быў знойдзены ў 2018 г. за 0,5 км на поўнач ад в. Ракаўцы (Удзелаўскі сельсавет). Знаходка была зроблена на сельскагаспадарчым полі, на левым беразе р. Маргва, каля 0,1 км ад русла. Звесткі аб спадарожных знаходках адсутнічаюць.

Тыпалогія: металічны аб'ёмны крыж тыпу VIII, падтыпу А паводле А.А. Башкова.

Даціроўка: XI–XII стст.

Параметры: памеры: 3,0 х 2,1 см; вага: 4 г; матэрыял: медны сплаў.

Спосаб вырабу: ліццё.

Крыж аб’ёмны, двухбаковы, чатырохканцовы, з шарыкападобнымі заканчэннямі на прамянях і з «шышачкай» на кожным шарыкападобным заканчэнні. Прамяні крыжа аднолькавай даўжыні, верхні мае кальцавое вушка для падвешвання. На перакладзінах па ўсёй акружнасці змяшчаецца неглыбокая папярэчная баразёнка. Сяродкрыжжа вырабу ромбападобнай формы, без выяў. Паціна на метале роўная, гладкая, карычнявата-шэрага колеру. На паверхні прадмета маецца некалькі ачагоў шэрых вокіслаў.

Аналагам нацельнага крыжа прадстаўленага тыпу з’яўляецца крыж, знойдзены ў адным з курганоў XI–XII стст. бліз г. Барысаў Мінскай вобласці [10].

**Крыж № 2** (мал.) быў знойдзены ў 2018 г. за 0,5 км на паўночны ўсход ад в. Шыпы (Абрубскі сельсавет). Знаходка была зроблена на сельскагаспадарчым полі, якое пралягае паміж чыгункай на паўднёвым усходзе і вясковымі могілкамі на паўночным захадзе. Як спадарожныя знаходкі можна адзначыць некалькі фрагментаў недатаванай керамікі.

Тыпалогія: металічны аб’ёмны крыж тыпу III, падтыпу А паводле А.А. Башкова.

Даціроўка: XI–XII стст.

Параметры крыжа: памеры: 2,1 х 1,6 см; вага: 2 г; матэрыял: медны сплаў.

Спосаб вырабу: ліццё.

Крыж аб’ёмны, двухбаковы, чатырохканцовы, з шарыкападобнымі заканчэннямі на прамянях. Прамяні крыжа аднолькавай даўжыні, верхні мае кальцавое вушка для падвешвання. Перакладзіны выцягнутыя, тонкія. Сяродкрыжжа вырабу квадратнай формы, без выяў. Паціна на метале роўная, гладкая, светла-шэрага колеру.

Зыходзячы з параўнальна невялікіх памераў крыжа, папярэдне можна меркаваць аб тым, што ён мог належыць дзіцяці.

**Крыж № 3** (мал.) быў знойдзены ў 2019 г. за 1,1 км на паўднёвы ўсход ад в. Хралы (Псуеўскі сельсавет). Знаходка была зроблена на сельскагаспадарчым полі, на паўночным беразе воз. Белае, каля 0,1 км ад берагавой лініі. Як спадарожныя знаходкі можна адзначыць некалькі фрагментаў недатаванай керамікі.

Тыпалогія: металічны аб’ёмны крыж тыпу VIII, падтыпу А, варыянта 1 паводле А.А. Башкова.

Даціроўка: XI–XII стст.

Параметры крыжа: памеры: 3,3 х 2,5 см; вага: 10 г; матэрыял: медны сплаў.

Спосаб вырабу: ліццё.

Крыж аб’ёмны, двухбаковы, чатырохканцовы, з шарыкападобнымі заканчэннямі на прамянях і са сферычнымым адросткам на кожным шарыкападобным заканчэнні. Прамяні крыжа аднолькавай даўжыні. Верхні мае масіўнае вушка для падвешвання з кальцавым патаўшчэннем па цэнтры, папярэчныя кальцавыя патаўшчэнні па ўсёй акружнасці змяшчаюцца таксама і на перакладзінах. Сяродкрыжжа вырабу ромбападобнае, з наяўнасцю рэльефнай выявы касога крыжа. Паціна на метале бугрыстая, шурпатая, зеленавата-шэрага колеру. На паверхні прадмета маецца тонкі слой белых вокіслаў.

**Крыж № 4** (мал.) быў знойдзены ў 2021 г. за 1,4 км на паўднёвы ўсход ад в. Ураджайная (Галубіцкі сельсавет). Знаходка была зроблена на лузе, на левым беразе руч. Зашчэсленскі, каля 0,2 км ад русла. Звесткі аб спадарожных знаходках адсутнічаюць.

Тыпалогія: нацельны крыж дадзенага тыпу не прадстаўлены ў тыпалогіі А. А. Башкова.

Даціроўка: XI–XII (?) стст.

Параметры крыжа: памеры: 3,3 х 2,6 см; вага: 6 г; матэрыял: медны сплаў.

Спосаб вырабу: ліццё.

Крыж аб’ёмны, двухбаковы, чатырохканцовы, з шарыкападобнымі заканчэннямі на прамянях і з конусападобнымі адросткамі на кожным з шарыкападобных заканчэнняў. Прамяні крыжа аднолькавай даўжыні. Верхні мае кальцавое вушка для падвешвання. На перакладзінах па ўсёй акружнасці змяшчаюцца папярэчныя кальцавыя патаўшчэнні. Сяродкрыжжа вырабу акруглае, з выявай рэльефнага касога крыжа. Паціна на метале роўная, гладкая, цёмна-шэрага колеру.

**Крыж № 5** (мал.) быў знойдзены ў 2022 г. за 1,1 км на паўночны ўсход ад в. Кісарэўшчына (Азярэцкі сельсавет). Знаходка была зроблена на сельгаспадарчым полі, на правым беразе р. Дабрылаўка, каля 0,1 км ад берагавой лініі. Як спадарожныя знаходкі можна адзначыць некалькі фрагментаў недатаванай керамікі і свінцовае прасліца.

Тып: металічны аб’ёмны крыж тыпу VIII, падтыпу А паводе А.А. Башкова.

Даціроўка: XI–XII стст.

Параметры крыжа: памеры: 3,3 х 2,4 см; вага: 9 г; матэрыял: медны сплаў.

Спосаб вырабу: ліццё.

Крыж аб’ёмны, двухбаковы, чатырохканцовы, з шарыкападобнымі заканчэннямі на прамянях і з «шышачкай» на кожным шарыкападобным заканчэнні. Прамяні крыжа аднолькавай даўжыні, аглаўе мае кальцавое вушка для падвешвання. На перакладзінах па ўсёй акружнасці змяшчаецца неглыбокая папярэчная баразёнка. Сяродкрыжжа вырабу ромбападобнай формы, без выяў. Паціна на метале бугрыстая, шурпатая, шэрага колеру. На паверхні прадмета маецца тонкі слой зеленаватых вокіслаў.

Як аналаг нацельнага крыжа прадстаўленага тыпу (разам з крыжом №1), можна адзначыць крыж, знойдзены ў адным з курганоў XI–XII стст. бліз г. Барысаў Мінскай вобласці [10].



№ 1 № 2 № 3 № 4 № 5

Малюнак – Нацельныя крыжы XI–XII стст. з тэрыторыі Глыбоцкага раёна

**Заключэнне.** Такім чынам, каштоўнасць нацельных крыжоў XI–XII стст., знойдзеных на тэрыторыі Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці, у тым, што гэта адзін з самых ранніх хрысціянскіх атрыбутаў, якія археалагічна фіксуюцца на тэрыторыі Беларусі. Іх з’яўленне разам са зменай пахавальнага абраду на мяжы X і XI стагоддзяў з’яўляецца бясспрэчным маркерам хрысціянізацыі жыхароў Полацкай зямлі.

Усе разгледжаныя прадметы адносяцца да тыпу нацельных крыжоў з шарападобнымі канцамі на цыліндрычных лопасцях. Яны адрозніваюцца пэўнымі элементамі і прапорцыямі. Але мы маем чатыры варыянты нацельных крыжоў аднаго і таго ж тыпу з улікам таго, што крыжы № 1 і № 5 аднолькавыя. Параўнанне

прадстаўленых у артыкуле нацельных крыжоў з Глыбоцкага раёна з крыжамі такога ж тыпу з іншых раёнаў Беларусі паказвае, што крыжы з Глыбоччыны паводле тыпалагічных асаблівасцяў адпавядаюць такім жа нацельным крыжам з іншых рэгіёнаў краіны.

Трэба таксама звярнуць увагу на тое, што амаль усе крыжы (за выключэннем крыжа № 2) былі знойдзеныя ў непасрэднай блізкасці ад вадаёмаў. Гэтыя абставіны, на наш погляд, могуць сведчыць аб магчымай наяўнасці бліз месцаў іх знаходжання невядомых дагэтуль сярэднявечных селішчаў.


1. Войтехович, А.В. Погребальный обряд населения Полоцкой земли в X–XII вв. / А.В. Войтехович; Нац. акад. Наук Беларуси, Ин-т истории. – Минск : Беларуская навука, 2019. – 269 с.
2. Штыхаў, Г.В. Крывічы: Па матэрыялах раскопак курганоў у Паўночнай Беларусі / Г.В. Штыхаў ; пад рэд. М.А. Ткачова. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 191 с.
3. Дучыц, Л. Язычніцтва старажытных беларусаў / Л. Дучыц, І. Клімковіч. – Мінск: Харвест, 2018. – 368 с.
4. Кайль, В.А. Каталог нательных христианских крестов, подвесок и накладок с изображением креста периода Киевской Руси X–XIII ст. / В. А. Кайль, В. В. Нечитайло. – Луганск, 2006. – 187 с.
5. Кутасов, С.Н. Нательные кресты, крестовключенные и крестовидные подвески X–XV веков / С.Н. Кутасов, А.Б. Селезнёв; под общ. ред. А.К. Станюковича. – М.: Группа «ИскателИ», 2010. – 320 с.
6. Археологическое наследие Беларуси = Archaeological Heritage of Belarus / Нац. акад. Наук Беларуси, Ин-т истории. – 2-е изд., испр. и доп. – Минск: Беларуская навука, 2020. – 200 с.
7. Павлова, М.П. Натільні хрести з поселення Феофанія (розкопки 2016–2017 рр.) / М.П. Павлова // Археологія і давня історія України. – Випуск 4. – Київ, 2019. – С. 247–254.
8. Труды Новгородской археологической экспедиции. Т. 11 / под. ред. А.В. Арциховского и Б.А. Колчина. – М.: АН СССР. – 1959. – 362 с.
9. Башков, А.А. Христианские древности Беларуси конца X–XIV вв. (предметы христианского культа индивидуального использования) / А.А. Башков. – Минск : И.П. Логвинов, 2011. – 194 с.
10. Ляўданскі, А.М. Археолёгічныя досьледы ў Барысаве / А.М. Ляўданскі // Запіскі аддзелу гуманітарных навук Беларускай Акадэміі навук. Кніга 11. Працы археолёгічнай камісіі. Т. II. – Мінск, 1930. – Т. II – С. 258.


## ИСТОРИЧЕСКАЯ ДИНАМИКА ПОЛИТИЧЕСКИХ ТРАДИЦИЙ ПО ЛИНИИ «ЗАПАД–ВОСТОК» ИЛИ ГЛАВНОЕ ПРОТИВОРЕЧИЕ СОВРЕМЕННОЙ ЭПОХИ


*А.В. Панченко*
*Минск, БНТУ*


Политические традиции воспроизводят из поколения в поколение устойчивые формы государства, власти, политики и связывают прошлый исторический опыт с современной политической практикой, воздействуют на нее, демонстрируя устойчивость форм политического сознания, политической культуры и политического поведения. Целью статьи является выявление роли западных и восточных политических традиций, обусловливающих не только социально-экономические, но духовные взаимодействия людей, нравственное и религиозное отношение человека к политической практике.

**Материал и методы.** Материалами для исследования послужили работы отечественных и зарубежных ученых, практический опыт чтения соответствующих политологических курсов. Исследование проводилось на основе общих и специальных методов политологии, в том числе компаративного, системного, аналитического методов, а также авторских обобщений и выводов.

**Результаты и их обсуждение.** Развитие государства стимулирует складывание политических традиций и их закрепление в политической деятельности, оформление в мифах, теориях и доктринах. Научный и практический интерес к политическим традициям активизируется в условиях переходного политического процесса, характеризуемого нестабильностью, неопределенностью и конфликтогенностью, высокими рисками военных столкновений различной степени интенсивности между государствами. Суть этих перемен, отмечает профессор Московского университета Е.Н. Мощелков, можно «адекватно понять и объяснить только в гораздо более широком историческом контексте, а именно – в глобальном контексте политических и социально-экономических изменений длительной, многовековой протяженности, рассматривая при этом данные перемены только как